

**ПІЎНЕВА Ксенія,**
студэнтка 5 курса
факультэта беларускай
і рускай філалогіі БДПУ.
Тэма: ***«Духоўныя арыенціры “танкаўцаў”»***

**Дух «танкаўца»... Не так проста гаварыць пра якасць духу «танкаўца». Складана, бо яго неверагодная невычэрпнасць і моц кідаецца ў вочы з самага пачатку. Кожны, хто калісьці быў знаёмы з сапраўдным «танкаўцам», адчувае шостым пачуццём яго своеасаблівую аўру, аўру непахіснасці, упартасці і веры ў сваю справу (у чым бы яна ні заключалася). Гэты дух ні на хвіліну не пакідае свайго гаспадара і адрознівае яго ад іншых прадстаўнікоў студэнцтва. «Што ж гэта за дух такі, чым мы яго заслужылі, адкуль ён узяўся?» – спытаюць многія, але нямногія дадуць адказ. Да і няма адназначнай дэфініцыі духу «танкаўца». Яго нельга спасцігнуць розумам, а можна толькі адчуць сэрцам. Маё сэрца адчувае гэты дух вельмі даўно, але толькі цяпер, калі мае шляхі з Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя Максіма Танка і родным факультэтам вось-вось разыдуцца, я пачала ўсведамляць гэты дух розумам. Таму ў гэты момант я магу гаварыць пра якасць гэтага духу, пра духоўныя арыенціры сапраўднага «танкаўца».**

**Складаныя філасофскія пытанні прымушалі людзей у розныя эпохі думаць, спрачацца, а бывалі выпадкі, што і паміраць. Філосафы спасцігалі жыццёвую мудрасць і неслі яе ў народ, тым самым рабілі свой уклад у развіццё цывілізацыі. Але цывілізацыя сыграла з намі злы жарт. Яна адмовілася ад філосафаў, і сёння кожны сам павінен шукаць іх ў сабе.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

існаванне сучаснага чалавека залежыць ад таго, як ён сам разумее сваё жыццё. У зоне рызыкі згубіць сваё «я» і заблытацца ў павуціне шляхоў заўсёды знаходзяцца тыя, хто перажывае пераходныя моманты. А гэта хто? Правільна – студэнцтва! Таму кожны з яго прадстаўнікоў павінен знайсці ў сабе таго філосафа і навучыцца жыць па «яго» запаветах. Вось тут у гульню ўступаюць арыентатары, прызваныя дапамагчы раскрыць духоўную моц, навучыць думаць і знаходзіць новыя шляхі. На ролю такога арыентатара якраз падыходзяць вышэйшыя навучальныя ўстановы (у нашым выпадку БДПУ). Духоўны арыенцір, які нам прывівае наша альма-матар, з'яўляецца ў той ці іншай меры агульным для ўсіх яе выхаванцаў. Вось адкуль у нас гэты дух!

Але які ён, гэты дух? Здаецца мне, што калі мы спытаем розных «танкаўцаў», то атрымаем зусім розныя адказы. Сапраўды. Але ўсе пагодзяцца з тым, што агульнага ў гэтых адказах будзе шмат. Агульнае тут тое, што мы ўсе розныя і што мы ўжо выбралі свой шлях, выбралі свой арыенцір. Напрыклад, мой шлях пачаўся і быў выбраны ўжо тады, калі я накіравала свае думкі аб выбары ўніверсітэта, менавіта да факультэта беларускай філалогіі і культуры (цяпер факультэта беларускай і рускай філалогіі). Факультэт асабіста мне дапамог сфармуляваць маё жаданне звязаць жыццё з друкаваным словам. Ужо потым даў магчымасць ганарыцца сваімі поспехамі і навучыў выходзіць з высока паднятай галавой з непрыемнасцяў і складаных сітуацый. А яшчэ навучыў не саромецца свайго выбару і быць непахіснай у сваіх рашэннях.

«Навошта саромецца свайго выбару?» – спытае нехта. Яшчэ адна рыса нашага студэнцтва – саромецца называцца «танкаўцам». Гэта адбываецца па многіх прычынах, адна з якіх заключаецца ў невысокім прэстыжы прафесіі настаўніка, ды і філолага, дарэчы, таксама. Першакурснікі час ад часу вымушаны падвяргацца насмешкам з боку сваіх равеснікаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

менавіта з-за свайго выбару, выбару быць некім і быць з чымсьці ў галаве. «Дзікая несправядлівасць і недасведчанасць!» – заўсёды казала і буду казаць я. Але мне давялося навучыцца глядзець на абставіны з пазітыўнага боку. Мы, «танкаўцы», затое вучымся быць гордымі, быць незалежнымі ад уздзеяння злых языкоў, быць шчырымі і вернымі. Несумненна, да гэтага яшчэ трэба прыйсці. Ніхто, канешне, не будзе спрачацца і наконт таго, што і сярод «танкаўцаў» ёсць залётныя птушкі, якія ніколі не зразумеюць, аб чым я пішу. Такіх варон можна пачуць яшчэ ў канцы калідора па гучным нахабным крумкатанні або ў чарзе буфета, калі нехта жадае падмацавацца без чаргі, або ў вялікай аўдыторыі па надакучлівым шчабятанні падчас навучальнага працэсу. Для іх дух «танкаўца» назаўсёды застанецца толькі незразумелай абстракцыяй.

Чым мы заслужылі такі моцны духоўны арыенцір? Усё даволі трывіяльна. Заслужылі мы яго сваёй працай, працай розуму і душы, а таксама вернасцю таму, што мы робім. І мы ўжо можам гаварыць не толькі пра колькасны паказчык нашай духоўнай моцы, але і пра яе высокую якасць. Якасць, якой мы, несумненна, вартыя. Яе нам пакінулі ў спадчыну ўсе тыя, хто калісьці падымаўся па лесвіцах універсітэта, падымаўся да сумленнага і напоўненага сэнсам жыцця. Згусткі моцнай волі нашых папярэднікаў адчуваюцца на нейкі момант нават фізічна. Я спадзяюся, што частка маёй волі «танкаўца» далучыцца да ўніверсітэцкага духу і застанецца жыць і далей у высокіх сценах БДПУ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ